НОВОСТИ ШУМИЛИНО SHUMILINO.BY
Официальный сайт газеты Шумилинского района “Герой працы”



Лариса Тихоненко заслужила общественное признание

Актуалии | Общество | Экономика

28.11.2019 shumilino 999

Руплівы кіраўнік, адказны дэпутат

Кажуць, каб працаваць у сельскай гаспадарцы, трэба мець асаблівую руплівасць і адказнасць, не баяцца нялёгкай штодзённай работы, а прафесію выбіраць па прызванні. Такое прызванне ёсць у начальніка раённай ветэрынарнай станцыі Ларысы Ісаеўны Ціханенкі, якая на гэтым тыдні адзначыла свой юбілей.



Павіншаваць Ларысу Ісаеўну прыехала кіраўніцтва раёна на чале са старшынёй райвыканкама Віктарам Гутаравым. Словы віншаванняў гучалі шчыра, ад душы. Віктар Сяргеевіч расказаў, што Ларыса Ціханенка і нарадзілася на Шуміліншчыне, і ўсё жыццё працуе тут у сельскай гаспадарцы. Яна рупілася галоўным ветурачом саўгаса імя Кароткіна, узначальвала свінагадоўчы комплекс, які ў свой час належаў УП “Шумілінскі райаграсэрвіс”, не пабаялася пасады дырэктара КУСГП “Сіроцінскі”, смела ўзялася за работу дзяржветінспектара. І ўсюды працавала старанна. Такая яна і зараз.

Амаль паўтара года з’яўляецца начальнікам райветстанцыі. Ларысу Ісаеўну можна ўбачыць на фермах раёна, на прыватных падворках грамадзян, ля сянажных траншэй не толькі ў рабочы час, але і вечарам, і ў выхадныя дні, і ў час водпуску. Перш чым складаць патрэбную справаздачу, яна ўсё пераправерыць сама, упэўніцца ў станоўчых прыкладах, ці, наадварот, у недапрацоўках, на свае вочы. Вось такая яна – ініцыятыўная, шчырая, адказная, прафесіянал сваёй справы, адзначыў кіраўнік раёна, калі ўручаў Ларысе Ісаеўне Ганаровую грамату райвыканкама.

Да віншаванняў далучылася старшыня раённага Савета дэпутатаў Ірына Новікава. Яна адзначыла, што Ларыса Ціханенка карыстаецца павагай сярод мясцовага насельніцтва – не дарэмна ж яе выбралі дэпутатам і раённага Савета дэпутатаў, і

сельскага Лаўжанскага. Ларыса Ісаеўна заўсёды ідзе насустрач людзям, дапамагае ў вырашэнні розных праблем, клапоціцца, каб землякам камфортна жылося на вёсцы. Калі ёсць праблемы з асвятленнем, работай аўталаўкі, людзі звяртаюцца да свайго дэпутата. А сёлета летам вырашылася пытанне з абсталяваннем пляжу на мясцовым возеры ў Добрыне.

Ларыса Ісаеўна ўважлівая і да свайго калектыву, дзе працуе сорак чалавек. Яна ўпэўнена, што для чалавека працы павінны быць розныя выгоды і льготы, таму ў райветстанцыі быў перагледжаны калектыўны дагавор у карысць людзей, адзначыла падчас віншавання старшыня райкама прафсаюза работнікаў АПК Вольга Пусянкова. Шмат цёплых слоў у дзень нараджэння Л. І. Ціханенцы сказалі ёй калегі. Яны адзначылі, што ветстанцыі пашанцавала на патрабавальнага, справядлівага і добрага кіраўніка, шчырага чалавека. У сваю чаргу Ларыса Ісаеўна адказала, што яна “ганарыцца сваім калектывам”, дзе кожны на сваім месцы, а ўся вялікая каманда мэтанакіравана на адказную справу, разам ажыццяўляе комплекс мерапрыемстваў па лячэнні і прафілактыцы захворванняў жывёл як у сельгаспрадпрыемствах, так і ў прыватным сектары.


Ларыса ЗАЙЦАВА.

Апублікавана ў №93 ад 29.11.2019 г.

ВСТУПАЙТЕ В НАШУ ГРУППУ «ВКОНТАКТЕ»

ЭТО МОЖЕТ БЫТЬ ИНТЕРЕСНО:





58,8% выпускников школ Шумилинского района стали студентами ВУЗов

31.08.2018

МНС разъяснило нюансы перехода на использование платежных терминалов в отдельных сферах

08.07.2024

Лукашенко вручил госнаграды самым успешным женщинам и генеральские погоны самым мужественным воинам

07.03.2023

МЫ В СОЦИАЛЬНЫХ СЕТЯХ

ЛЕНТА НОВОСТЕЙ



МНС прокомментировало планируемое повышение налога на квартиры

09.10.2024 0



12 октября осенняя ярмарка пройдёт в г.п. Оболь Шумилинского раойна

09.10.2024 0



Секреты высоких надоев в КФХ «Родник»

09.10.2024 0



Лучших педагогов района наградили к профессиональному празднику

09.10.2024 0



Кто победил в осеннем туре интеллектуального турнира «Игры разума»

09.10.2024 0



7 октября стартовала республиканская информационно-пропагандистская кампания МЧС «Молодёжь за безопасность!»

09.10.2024 0



За курение в постели — штраф!

09.10.2024 0



В районе проходит оперативно-профилактическое мероприятие «Арсенал»

09.10.2024 0

На контроле — госзакупки и уборка урожая

09.10.2024 0

«Помним героев, боль и горе». Лукашенко проникновенно представил обращение глав СНГ к 80-летию Победы

08.10.2024 0

На какую финансовую помощь может рассчитывать семья при рождении ребенка, рассказали в Минтруда

08.10.2024 0

Лукьянов рассказал, какой подарок получит Молодечно от участников «Марафона единства»

08.10.2024 0

Лукашенко в Москве напомнил о силе исторического единства народов Содружества, которая тревожит Запад

08.10.2024 0

О ГАЗЕТЕ

СТАТИСТИКА САЙТА





ГЛАВНЫЙ РЕДАКТОР

Карпушенко Елена Николаевна
8(02130)5-34-13

АДРЕС РЕДАКЦИИ

211259, г.п. Шумилино, ул Ленинская, 24

РАЗМЕСТИТЬ РЕКЛАМУ В ГАЗЕТЕ И НА САЙТЕ

тел./факс 8(02130)5-34-09
G_pracy@vitebsk.by, reklama@shumilino.by

«ГЕРОЙ ПРАЦЫ» В СОЦИАЛЬНЫХ СЕТЯХ

© 2019 Шумилино | «Герой працы» | Все права защищены. Допускается цитирование материалов при условии размещения в тексте ссылки на сайт газеты «Герой працы» www.shumilino.by